

*На вышыні,*

*дзе колер неба сіні,*

*Я ў час паўдзённы*

*выразаў санет*

*Адно таму,*

*хто на вяршыні.*

# Іван Бунін

## Выбраная паэзія

п

*паэты планеты*



# Іван
# Бунін

## Выбраная паэзія

*Пераклад з рускай*
*Георгія Ліхтаровіча*

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2022

УДК 821.161.1-1
ББК 84(4Рус)-5
Б91

Серыя заснаваная ў 2016 годзе.

Рэдкалегія серыі:

Л. Баршчэўскі, Зм. Колас, І. Крэбс,
А. Хадановіч, Г. Янкута

Перакладзена паводле выдання:
Иван Бунин. *Полное собрание сочинений в 13 т*. Т. 1–2.
Москва: Воскресенье, 2006.

На вокладцы:

*Леанард Туржанскі,*
*Партрэт Івана Буніна (1905).*

**ISBN 978-985-23-0167-1**

©Ліхтаровіча Г. Л., пераклад на беларускую мову, 2022.
©Дызайн серыі. Русецкі М. І., 2016.
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2022.

## ***Вясковы жабрак***

*(Деревенский нищий)*

Убаку ад дарогі, пад дубам,
Дзе чаўрэе ад спёкі хмызняк
У бравэрцы, залатанай груба,
Спіць пад сонцам старэча жабрак.

Ён знямог ад далёкай дарогі
І прылёг ля мяжы падрамаць,
Бо гудуць у гаротніка ногі,
Грудзі й шыя ад сонца смыляць...

Пэўна, нэндза адолела надта:
Больш няма дзе прытулку шукаць.
Лёс няўмольны – туляцца па хатах,
Са слязьмі каля вокнаў стагнаць...

Не пабачыш такога ў сталіцы:
Тут, і праўда, адно ў жабракі!
Па-за кратамі ў цёмнай вязніцы
Рэдка бачны пакутнік такі.

Ён за век свой нямалыя сілы
За няўдзячнаю працай згубіў
Ды, напэўна, ля краю магілы
Не стае ўжо няўдатніку сіл.

Ад сяла да сяля чыкільгае,
Ледзь у стане малітву тварыць.
Блізка смерць, ды нямала стрывае
Да яе гарапашнік стары.

Ён заснуў... Ну, а потым са стогнам
Дзеля Бога малі ды прасі...
Сумна бачыць пакуты. Як многа
І тугі, і бяды на Русі!

*1886 (Першы надрукаваны верш)*

## *У стэпе*

*(В степи)*

*М. Д. Целяшову*

Учора ў сонным стэпе чуў здалёк я
Крык жураvoў. Так лёгка ў вышыні
Ён празвінеў над ціхімі палямі...
Шлях добры! Не шкада ім нас кідаць:
Абноўленая ў квецені прырода,
Іх новая вясна цяпер чакае
За сінімі, за цёплымі мара́мі,
Да нас жа йдзе панылая зіма:
Засох наш стэп. Лес глухне і жаўцее,
Асенні вецер ускудлаціў хмары,
Звярыныя хады ў кустах адкрыў,
Засыпаў лісцем долы ды яругі.
Начамі ў таямнічай чарнаце,
Пад пошум дрэваў, свечкамі мільгаюць,
Ваўчыныя блукаючыя вочы...
Так, родны край не цешыць нас цяпер!
Але ж, вандроўныя істоты-птахі,
Не абуджае зайздрасці ўва мне
Ваш звонкі крык і горды, і свабодны.

Чакаем сумна змрочнае пары,
Калі туман сівы ў палях начуе,
Калі ў імгле світанак ледзь бялее,
Адно грудкі чарнеюць праз туман.
Люблю я, пералётныя істоты,
І родны стэп, і бедныя сялібы –
Мая радзіма; я вярнуўся к ёй,
Стамлёны ад блуканняў адзінокіх,
І зразумеў красу ў яе сумоце
І шчасце – у сумотнае красе.

Бываюць дні: павее цёплым ветрам,
Прагляне сонца і азорыць ярка
І лес, і стэп, і даўнюю сядзібу,
Угрэе вільгасць лісця і зямлі,
Глядзіш – і зноў усё павесялела!
Як хораша, істоты качавыя,
У нас тады! Як весела і сумна
Ў пустэльным лесе між галін счарнелых,
Між залатой лістотаю бяроз
Пяшчотна неба нашае сінее!
У тыя дні люблю я асабліва
Асіннікаў пабляклых тонкі пах
І слухаю драздоў пралётных крыкі;
Люблю адзін пайсці на дальні хутар,
Глядзець, як рунь пяшчотна зелянее
І як ралля ярчэе аксамітам,
А воддаль, на іржышчах залатых,
Стаіць туман блакітны і ажурны.

Мая вясна тады заве мяне, –
Мары любві далёкага юнацтва,
Калі я вас, істотаў пералётных,
Праводзячы на поўдзень, сумаваў!
Мне ўспамінаецца былое шчасце,
Былыя дні… Ды не шкада былога:
Я не сумую сёння па былым, –
Яно жыве ў маім маўклівым сэрцы,
А свет паўсюль напоўнены красой.
Мне блізкае ўсё ў ім і дарагое:
І бляск вясны за морамі сінечы,
І поўначы няшчодрыя палі,
І нават тое, што зусім не ў стане
Суцешыць вас, вандроўныя чароды, –
Пакора ўласнай долі і журбе!

*1889*

***

*(В туче, солнце заступающей...)*

Засціць сонца хмарай волкаю,
Неба першы гром кранyў,
І анёл, што ззяў вясёлкаю,
Крыжам залатым махнуў –
І сарваўся бурай, холадам,
З пылам зносячы бур'ян,
І панёсся шумна, молада,
Дымным ліўнем ураган.

*1891*

## *Анёл*

*(Ангел)*

Увечары, над стэпам мірным,
Калі над светам захад ззяў,
Сярод нябёс, пуцём эфірным,
Анёл вячэрні пралятаў.

Ён бачыў: спее змрок марудна, –
Усход удалечы сінеў, –
І раптам гук пачуў – ледзь чутна
Ў жытах дзіцёнак штосці пеў.

Ідзе і каласы збірае,
Пляце вянок, пяе ў цішы,
Былі ў тым спеве гукі раю, –
Нявіннай, незямной душы.

«Дабраславі малога брата, –
Сказаў Гасподзь. – Дабраславі!
Хай ступіць вечаровым святам
На сцежку праўды і – любві!»

І тут анёл усмешкай чыстай
Дзіцёнка ціха прасвятліў
І ў захад зыбка-прамяністы
Падняўся ў бляску лёгкіх крыл.

І, быццам крылы залатыя,
Зара палала ў вышыні.
І доўга вочы маладыя
За ёй сачылі ў цішыні!

*1891*

***

*(В стороне далекой от родного края...)*

У старонцы дальняй ад святога краю
Сніцца нашых вёсак ціхая глухмень,
Пры дарозе ў полі белая бяроза,
Ворыва ды руні – красавіцкі дзень.
Ласкава сінее ранішняе неба,
Лёгкім белым зыбам воблакі плывуць,
Грак паважна крочыць па раллі за плугам,
Па́ры бляск над полем... А наўкол пяюць
Жаўрукі ў празрыстай вышыні паветра,
Пошчакі з нябёсаў на зямлю ліюць.

У старонцы дальняй ад святога краю
Дзеўчынай-нявестай сніцца мне Вясна:
Вочы ў колер неба, тварык хударлявы,
Зграбны стан высокі, светлая каса.
Весела на полі цёплым ясным ранкам!
Родны край ёй мілы – рунь і ярына.
Цешыць сэрца поўнач,
Плён сялянскай працы,
І глядзіць прыязна на палі яна:
На губах усмешка, а ў паглядзе роздум –
Шчасця і юнацтва першая вясна!

*1893*

## ***Вясновае***

*(Весеннее)*

Талы снег – і сонца зырка
Ззяе ў поўдзень над палямі;
Вецер вогка ў бляску сонца
Па лясах-палях гуляе.
Ды палі яшчэ пустыя,
Ды лясы яшчэ маўклівы;
Толькі сосны, быццам арфы,
Напяваюць аднастайна.
І пад іх напеў няясны
Ў запаведных нетрах бору
Спіць сабе вясна-царэўна
Ў беласнежным саркафагу.
Спіць, – а хутка ўжо ў далінах
Сонца белы снег растопіць,
І бурліць патокі пойдуць
Па ярах і па далінах.
Наляцяць лясныя птушкі,
Зашумяць гракі, а з імі –
Зацвітуць, зазелянеюць,
Ажывуць лясы з гаямі.

Прыйдзе красавік-царэвіч
З берагоў заморскіх, дальніх
На зары, калі ў далінах
Растае імгла туманаў,
На зары, калі ад сонца
Пахне лес зялёнай хвояй.
Пахне цёплаю зямлёю,
Красавіцкім першацветам.
Ён нахіліцца з усмешкай
Над царэўнаю маўклівай
І прытуліцца да вуснаў
Страсна вуснамі сваімі,
І царэўна схамянецца,
Гляне і сваёй усмешкай
Закаханы свет адорыць!

*1893*

## ***Сёмуха***

*(Троица)*

Зноў дабравест гудзе – да храма заклікае,
У сонечным святле над нівамі звініць;
І паплавоў мяжа ў блакіце патанае,
І рэчка на лугах іскрыцца і гарыць.

А зранку на сяле ідзе абедня ў храме:
Зялёнаю травой абсыпаны амбон,
І кветкамі алтар убраны святарамі,
І свечкі, як бурштын, ярчэюць ля ікон.

І звонка хор пяе, вясёла і нястройна,
І ў вокны вецярок лье водару струмень...
Стамлёны, ціхі брат, твой сёння будзе дзень.
Святкуй сваю вясну і светла, і спакойна!

Ты сёння з веснавых засеяных палёў
Прынёс сюды дары: зычэнне ў працы спору,
Бярозак маладых вясновае галлё,
Маркоты ціхі ўздых, малітву – і пакору.

*1893*

***

*(Неуловимый свет разлился над землею...)*

Няўлоўнае святло ліецца над зямлёю,
Над стрэхамі бязмоўнага сяла.
І перапёлак спеў перад зарою
Разносіць стэпам сонная імгла.

Няма й душы наўкол – ні гуку, ні трывогі...
Спяць ціхамірным сном зялёныя аўсы...
На купіне прыснуў шулёнак ля дарогі,
Пакрыты пылам матавай расы...

Ды ўжо ярчэе даль... Зялёна-серабрыста
Святло няўлоўна ўсходзіць над зямлёй,
І па́ра на лугах, халодных і душыстых,
Як фіміям, плыве перад зарой.

*1894*

## *Завея*
*(Метель)*

Ноччу ў палях, пад завеі напевы
Ціха хістаюцца сонныя дрэвы...
Месяц між хмарак над стэпам заззяе, –
Цень на зямлі растае і збягае...
Мроіцца ноччу: між белых бяроз,
Ззяннем туманным блукае Мароз.

Ноччу ў жытле, пад напевы вятрыскі,
Чуецца ціха рыпенне калыскі...
Поўні святло ў цемнаце серабрыцца –
Ў мёрзлыя шыбы па лаўках бруіцца...
Мроіцца ноччу: між вецця бяроз
Бачыць знямелыя хаты Мароз.

Мёртвае поле, дарога без краю!
Дуйка начная цябе замятае,
Спяць твае сёлы пад замяць дрымотна,
Мёрзнуць у снезе яліны самотна...
Трызніцца мне: тут не стэпы зусім –
Ходзіць Мароз на пагосце глухім...

*1887–1895*

***

*(Ночь наступила, день угас...)*

Ноч надышла, а дзень прыгас,
Сон і спакой – і ўсёй душою
Скараюся я ў гэты час
Начному дзіўнаму спакою.

Як лёгка водару ў грудзях,
Што сад пяшчотна выдыхае!
Як мірна і святліста ззяе
Ў далёкім небе Млечны Шлях!

Але за ўсе былыя дні,
За ўсё, што з болем я хаваю
Ў душы і ў сэрца глыбіні, –
Нікога я не дакараю.

За светласць успамінаў тых,
За тыя шчасныя мінуты
Дабраслаўляю кожны міг
Былога шчасця і пакуты!

*1895*

***

*(Вьется путь в снегах, в степи широкой...)*

Шлях віецца ў снезе. Стэп шырокі.
Вось – лугі, а па-над ярам мост,
Пад гарой пасёлак адзінокі,
На гары – закінуты пагост.

Ні душы ў пасёлку; не цяплеюць
Там з-пад стрэх вячэрнія агні;
Слепа зрубы змрочныя чарнеюць...
Ведаю – пакінуты яны.

Веюць зімным попелам, жудою,
Коміны праваленыя хат.
Вёска дажывае нежылою.
Халадэча, мёртвы заняпад.

Па застрэшшах вецер злы віруе,
Сыпле снегам... Толькі ён адзін
Па табе, радзімы край, сумуе
Пасярод пустых тваіх раўнін!

Шлях бяжыць, завея ў стэпе грае,
Хмурна млее доўгай ночы цень...
Хай хутчэй, нарэшце, памірае
Гэты цьмяны і жахлівы дзень!

*1897*

## ***На хутары***

*(На хуторе)*

Свечкі нагарэлі, доўгі зімні вечар...
Сеў ты на ляжанку, ціха ўзняў пагляд –
І гучыць гітара ўдаласцю журботнай
Песні бесклапотнай, даўняй песні ў лад.

«Дзе цяпер, маё ты шчасце залатое?
Хто цябе развеяў па сівых палях?
З захаду не ўзняцца сонейку над стэпам,
Нам не апынуцца ў незваротных днях!»

Свечкі нагарэлі, доўгі зімні вечар...
Бровы сумна ўзняў ты і адвёў пагляд...
Не суддзя табе я за грахі былога!
Ні жыцця, ні шчасця не вярнуць назад!

*1897*

***

*(Скачет пристяжная, снегом обдает...)*

Скача прыпражная, снегам абдае...
Сонны зімні вецер нада мной пяе,
У паўсне трывожным па палях бяжыць,
Разам з шаргункамі жаласна дрыжыць.

Гэй, прачніся, вецер! Уздымі пургу;
Задыміся дуйкай белай на бягу,
Закружыся стэпам, вірам закруці,
Крыкні заміж песні: «Сорамна, не спі!»

Без уцехі шлях мой! Кожны дзень наўкол –
Глуш лясоў ды холад-голад наскіх сёл...
Сорамна й балюча... Толькі сорам мой
Надта хутка гасне ў цішыні нямой!

Сонны зімні вецер нада мной пяе,
Усыпляе спевам, волі не дае,
Шлях заносіць снегам, па палях бяжыць,
Разам з шаргункамі жаласна дрыжыць...

*1897*

***

*(Я к ней вошел в полночный час...)*

Зайшоў апоўначы ў пакой.
Дзяўчына спала – поўня ззяла
Ў яе акно, – яна кранала
Атласнай коўдры край рукой.

Ляжала тварам да мяне,
Раздвоіўшы тугія грудзі, –
Стаяла, як вада ў запрудзе,
Яе жыццё ў ціхмяным сне.

*1898*

***

*(Снова сон, пленительный и сладкий...)*

Зноўку сон, чароўны і салодкі,
Радасцю п'янкою сніцца мне, –
Мілы позірк, звабліва-дрыготкі
Кліча ўсмешкай вабнаю мяне.

Ведаю – падманны сон растане,
Абуджуся я ў будзённым дні.
Ды пакуль той сумны дзень настане,
Усміхніся мне – і падмані!

*1898*

***

*(Звезды ночью весенней нежнее...)*

Зоркі ноччу вясновай пяшчотней,
Спеў салоўкі амаль шапаткі...
Я люблю тыя цёмныя ночы,
Зоркі ў небе, ля клёнаў стаўкі.

Ты, як зорачка, свецішся ясна...
Смак і радасць жыцця я лаўлю
Ў зорным небе, у водарах кветак...
Ды цябе я пяшчотней люблю.

Я шчаслівы з табою адзінай,
І цябе не заменіць ніхто:
Ты адна мяне ў свеце кахаеш,
І адна разумееш – за што!

*1898*

***

*(Все лес и лес. А день темнеет...)*

За лесам лес. А дзень цямнее;
Нізы сінеюць, і трава
Сівой расой на лузе млее...
Лунае шэрая сава.

На захад чарадою сосны
Ідуць, як войска вартавых,
І сонейка – Жар-Птах дзівосны
Палае ў нетрах векавых.

*1899*

***

*(Еще утро не скоро, не скоро...)*

Яшчэ ранак не скора, не скора:
Ноч з ціхмяных лясоў не сышла.
Пад павецямі соннага бору
Цёпла днее дасвецця імгла.

Яшчэ птушкі спяваць не павінны,
Ледзь шарэе сутонне нябёс,
Зелянеюць груваcтка яліны,
Пахне хвояй і вільгаццю рос.

І няхай нам даўжэй не світае
Хай блукае дарога ў лясах;
Ноч ніколі не вернецца тая,
Дзе нам лёгкі да ростані шлях...

Шаргунок у маўклівасці бору
То замрэ, то ізноў зазвініць...
Па далінах ноч ціхая спіць...
Яшчэ ранак не скора, не скора.

*1900*

## *Крыніца*

*(Родник)*

Дзе глуш, дзе лес стаіць зялёны,
Заўжды халодны і сыры, –
Там з яру, з камянёў гары
Бруіць-цячэ струмень сцюдзёны:

Спяшае, грае і кіпіць,
Імкне хрустальнымі вірамі,
І пад цяністымі дубамі,
Нібыта вадкім шклом, бяжыць.

А небасхіл і лес нагорны
Глядзяць задумліва ў цішы́,
Як пад вадою галышы
Трымцяць мазаікай узорнай.

*1900*

## *Ноч на Вадохрышча*
*(Крещенская ночь)*

Цёмны ельнік снягамі, як футрам,
Маразы апушылі сівыя,
Шэрань бліскае, быццам алмазы.
Сняць бярозы дзянькі веснавыя.

Нахіліліся дрэвы ў дрымоце,
І між веццяя, якое застыла,
На чароўнае снежнае ўлонне
Поўня ціха глядзіць з небасхілу –

Узнялася высока над лесам
І здранцвела святлістым раздоллем.
Мудрагеліста сцеляцца цені
Чорнай сеткай на снезе пад голлем.

Замяло неруш лесу завеяй, –
Толькі сцежкі ярчэюць ад поўні,
Што бягуць між сасонак і елак,
Між бяроз да збуцвелай вартоўні.

Завіруха сівая заспала
Дзікай песняю лес апусцелы,
І заснуў ён, засыпаны снегам,
Нерухомы, празрысты і белы.

Спяць таемныя, зграбныя нетры,
Спяць пад снегам пухнатым, глыбокім
І паляны, і луг, і лагчыны,
Дзе калісьці шумелі патокі.

Цішыня, – і галінка не хрусне!
А, магчыма, за гэтай градою
Прабіраецца воўк па сумётах
Асцярожнай падступнай хадою.

Цішыня, – а мажліва, ён блізка…
Я спыняюся, поўны трывогі,
На гушчар увесь час пазіраю,
На сляды і кусты ўздоўж дарогі.

У гушчэчы, дзе з вецця і ценяў
Месяц промнямі ўзоры сплятае,
Мне ўсё мроіцца нешта жывое,
Быццам зграя звяркоў прабягае.

А лясное вартоўні агеньчык
Асцярожна й нясмела мігае,
Ён нібыта стаіўся пад лесам
І чагосьці ў зацішшы чакае.

Дыяментам празрыстым і яркім,
То зялёным, то сінім іграе
Каля Божага трона, на ўсходзе,
Зорка ціха блішчыць, як жывая.

А вышэй і вышэй па-над лесам
Поўня ўсходзіць, – і ў дзіўным спакоі
Замірае марозная поўнач
І крыштальнае царства лясное!

*1886–1901*

***

*(Раскрылось небо голубое...)*

Блакіт раскрыўся ў паднябессі,
Між аблачын – вясновы дзень.
Сухое, шэрае ўсё ў лесе,
Паслаўся павуціннем цень.

Змяя шуршыць лісцём дубовым,
Заварушылася ў галлі,
Паўзе, паблісквае ліловай,
Іскрыстай скурай па зямлі.

Сухое лісце, водар цьмяны,
Бяроз атласная смуга...
О, міг шчаслівы, міг падманны,
Стакроць лагодная туга!

*1901*

***

*(На высоте, на снеговой вершине...)*

На вышыні, на снегавой вяршыні,
Я выразаў стальным клінком санет.
Мінаюць дні. Мо ў гэтым напаміне
Снягі хаваюць мой самотны след.

На вышыні, дзе колер неба сіні,
Дзе радуе святло зімовы свет,
Глядзела толькі сонца, як штылет
Даверыў верш смарагдавай ільдзіне.

І весела мне думаць, што паэт
Спасцігне. Хай не вабіў у даліне
Яго натоўпу ветлівы імпэт!

На вышыні, дзе колер неба сіні,
Я ў час паўдзённы выразаў санет
Адно таму, хто на вяршыні.

*1901*

***

*(Гроза прошла над лесом стороною...)*

Аціхла навальніца за гарою.
Быў цёплы дождж, стаіць вада ў траве...
Іду адзін сцяжынкаю лясною,
У небе вечаровым нада мною
Слязой ярчэе зорка ў сіняве.

Іду – і ўспамінаецца міргание
Зор іншых – дзіўных веяў-таямніц,
І ноч, і хмар спякотнае дыханне,
І навальніцы маладое ранне,
І трапятанне ранішніх зарніц...

Пранеслася ўсё, як віхор вясною,
Ды ў сэрцы я каханне захаваў...
І ў паднябессі светлаю слязою
Вяснова зорка ззяе нада мною...
Як я цябе кахаў!

*1901*

## *У старым горадзе*

*(В старом городе)*

З цёмнай стромкай вежы звон паныла
Абвяшчае нам, што змрок бліжэй.
Вось і зноўку горад ноч стуліла
Ў мяккі змрок ад стомленых вачэй.

І сыходзіць ціхі час спакою
На людскія справы. З вышыні
Сумна свецяць зоркі. А зямное
Вартай смерць цікуе ў цішыні.

Вуліцай брыдзе яна надрэчнай,
Бачыць вокны, чорныя ад цьмы.
Глуха ўсюды. З пыхаю спрадвечнай
У завулках высяцца дамы.

У садах платаны там квітнеюць,
Вольна вее ранняю вясной.
Ля вакон красуні ў марах млеюць,
Свежасцю ўпіваюцца начной.

Толькі ім не страшны і не сумны
Блізкай смерці ўважлівы дазор,
Сонны горад, чорных вежаў думы
І старых гадзіннікаў дакор.

*1901*

## *Урывак*

*(Отрывок)*

Я ў вокнах бачу купы аблачын,
Халодных, беласнежных, як зімою,
І яркасць неба ў вільгаці блакіту.
Асенні поўдзень светлы, і на поўнач
Сыходзяць хмары. Клёны залатыя
І белыя бярозкі ля балкона
Свіцяцца ў небе негустым лісцём,
І крышталём на іх ільдзінкі ззяюць,
Што растаюць на голлі, а за домам
Шалее вецер... Дзверы на балконе
Заклееныя дбайна да зімы,
Дубэльты і прапаленыя печы –
Ахоўваюць лядашчы дом ад сцюжы,
А па спусцелым садзе кружыць вецер –
Лістоту падмятае па прысадах,
Гудзе ў старых бярозах... Светлы дзень,
Ды холадна, – да снегу недалёка.

Я часта ўспамінаю восень поўдня...
Цяпер на Чорным моры несупынна
Бушуюць буры: цьмяны бляск ад сонца,
Скалісты бераг, велічны прыбой
І пена, што зіхціць па хвалях шумных...

Ты помніш бераг той, аблямаваны
Яе шырокай снегавой градой?
Бывала, да вады збяжым са стромы
І прагна ловім вецер. Вольна вее
Бадзёрасцю і свежасцю марской;
Зрывае пырскі з бурнага прыбою,
Вільготным пылам поўніць ён паветра,
Над хвалямі ўздымае снежных чаіц.
Мы ў шуме хваль крычым яму насустрач,
Ён валіць з ног і заглушае голас,
А нам прывольна й весела, як птушкам...
Мне гэта ўсё здаецца сном цяпер.

*1901*

***

*(Морозное дыхание метели...)*

Марозны подых цёмнае завеі
Яшчэ свяжэе, але ўжо ў лагі
Імшыстым ложкам паляглі снягі,
Жалобна ў гурбах ельнік ледзянее.

Ноч атуляе чарнатой нябёс, –
А ў глыбіні, дзе Млечны Шлях бялее,
Дно свету, таемнічага наскрозь
Сузор'яў халадэчай палымнее.

Цямнеюць часам там абрыўкі хмар,
Ды стыне ноч. І нізка над зямлёю
Віхор у стоме слізгае змяёю,
Шыпіць і паліць, што сухі пажар.

*1901*

***

*(Не устану воспевать вас, звезды!..)*

Не стамлюся апяваць вас, зоркі!
Вас, таемных і адвечна юных.
Я здавён нясмела спасцігаю
Цёмнай прорвы залатыя руны.

Падсвядома вас любіў малечай, –
Казкаю пяшчотнай вы мігцелі.
У гады юнацтва толькі з вамі
Я дзяліў журботы і надзеі.

Першыя прызнанні ўспамінаю
І між вас шукаю вобраз мілы...
Пройдуць дні – вы будзеце свяціцца
Над маёй забытаю магілай.

Вас, магчыма, зразумею, зоркі,
І магчыма, мара зможа збыцца,
Што зямным журботам і надзеям –
Лёс з нябеснай таямніцай зліцца!

*1901*

## *Валацугі*
*(Бродяги)*

На занядбаным арэнбургскім тракце,
У ціхай і бясплоднай катлавіне,
Ля бальшаку, што сцелецца на ўсход,
На лузе – палатняная кібітка
І бродзіць кляча ў путах. Ні душы
Няма, – цыган адно ў кібітцы дрэмле,
Дзяўчо-падлетак проста ля дарогі
Сядзіць сабе, амаль што безуважна
Глядзіць на захад у нудоце звыклай:
На сонейка, што за раллю сыходзіць,
На промняў бляск па-над адхонам ціхім.
У лахманах, стуліўшыся пад ветрам,
Цікуе ў адзіноце за халодным,
Сумотным сонцам, ценем ад груда,
Пунсовым пылам, што з дарогі вее
З-пад капытоў кабылы, – то маўчыць,
То быццам мроіць, – штосьці напявае...
Якая глуш! Жыцця якая ўбогасць!
Якія ўсцяж тужлівыя напевы!

Вось вечарэе, сонца ў хмарку села,
Цямнее ў катлавіне, ветрык вее,
І ноч ідзе... Пашлі, Гасподзь, бадзякам
Не думаць днём, не чуць, як цёмнай ноччу
Туляецца ў сухім бур'яне вецер
І нешта шэпча, як у забыцці!
Дзяўчушка, пад кібіткай спі! Прачнешся –
Абудзіш бацьку, клячу запражэш
І – у дарогу зноў... Нашто – хто скажа?
Жыццё маўкліва, як магіла ў полі.

*1902*

## ***Смерць***
*(Смерть)*

Пад месяцам спакойна на пагосце...
Крыжоў абдымкі, камні, бэз ля сцен...
Ды вось наш склеп, куды прыйду не ў госці.
Як цёмны прывід, выцягнуўся цень.

Мне вусцішна. Бы мой двайнік магільны
Пры месяцы чакае на мяне...
Ды я іду – і цень, як раб бяссільны,
Ізноў паўзе, ізноў пакорны мне!

*1902*

***

*(Чашу с темным вином...)*

Чару з цёмным вінам
Падала мне багіня жалобы.
Я віно ціха выпіў
І ў стоме смяротнай панік.
І сказала нядбала,
З халоднай усмешкай багіня:
«Смачны хмельны мой яд.
Гэта лозы з магілы любві».

*1902*

## *Напярэдадні Купалля*

*(Канун Купалы)*

Не туман бялее цёмным гаем
Ходзіць па гаёчку Панна-Маці,
Па грудках зялёных, па лагчынах
Травы святаянскія збірае.

Часу ім застаўся толькі вечар,
Пагатоў ужо садзіцца сонца:
Цёмныя яліны засцяць захад,
Залаты іканастас змяркання...

Вільгаццю ў далінах леглі цені,
І лугі сінеюць, росы ўпалі,
Пахне пад расою медуніца,
Золатам вянец у цемры свеціць.

Як туман, бялюткае адзенне,
А вачэй блакіт, нібыта зоркі.
Пазбірае кветачкі ды зёлкі
І да Божага адправіць трона.

Хутка ноч – апошняя для зёлак,
А на золку косамі іх зрэжуць,
А не скосяць – сонца згубіць спёкай.
Так і скажа сыну Панна-Маці:

«Паглядзі, сынок мой улюбёны,
Як зямля цвіла і красавала!
Ды нядоўгі век зямным уцехам:
Смерць паўсюль, яна й Жыццём кіруе».

Ды Хрыстос ёй кажа: «Не! Не сонца,
А зямлю начная цемра крые:
Смерць не семя нішчыць, а зразае
Толькі кветкі ад жыцця зямнога.

І зямлі насенне не зніцее.
Скосіць Смерць – Любоў ізноў пасее.
Радуйся, Любімая! Ты будзеш
Суцяшацца да сканчэння веку!»

*1903*

## *Адзінота*

*(Одиночество)*

І вецер, і дождджык імжыць
  Над халоднай пустэчай вады.
Тут жыццю да вясны ўжо не жыць,
  Да вясны апусцелі сады.
Я на дачы адзін. Цёмна мне
За мальбертам, праз шыбіну дзьме.

Зайсці толькі ўчора змагла,
  Ды табе ўжо маркотна ў мяне.
Хоць увечары слота была,
  Ты здавалася жонкаю мне...
Што ж, бывай! Дажыву да вясны
І без жонкі сасню свае сны...

А сёння плывуць зноў на дом
  Тыя ж хмары – града за градой.
Каля ганка твой след пад дажджом
  Расплыўся, наліўся вадой.
І балюча глядзець аднаму
Ў вечаровую шэрую цьму.

Хацеў, ды не крыкнуў дарма:
  «Пачакай, я зрадніўся з табой!»
Ды былога ў жанчыны няма:
  Разлюбіла – няблізкім стаў ёй.
Што ж! Камін запалю, буду піць…
І нядрэнна б сабаку купіць.

*1903*

## *Сутонне*
*(Сумерки)*

Сівая скрозь смуга марозу
Сутоніцца ўначы дымком.
Як прывід, шэрая бяроза
Стаіць маўкліва за акном.

Таемна ўсё ў кутах сцямнела,
Ледзь свеціць печ, і нечы цень
Лунае над усім нясмела, –
Сум, што праводзіць гэты дзень.

Сум, што на захадзе разліты
На попельным пухнатым тле,
І ў тонкім водары нябыту
Ад дроў смалістых у паўмгле.

І ў цішыні, працятай змрокам,
Дзе прывіду нядоўга днець,
Ён з нейкай думай пільным вокам
Глядзіць праз цемру на мяне.

*1903*

## *У гарах*

*(В горах)*

Кружляе дыскам залатым
У прорве чорнай хмары поўня
І растае, і лье праз дым
Свой бляск, каб стромы ім запоўніць.

Але зірні на гарызонт:
Яна стаіць, а дым мільгае...
Не Час у вечнасць уцякае,
А існаванне бляклы сон!

*1903–1904*

## *Прывіды*
*(Призраки)*

Не, не памерлі мёртвыя для нас!
  Старое ёсць шатландскае паданне,
Іх цені, што не бачны ў цёмны час,
  Апоўначы прыходзяць на спатканне,

І пыльных арфаў, што ў кутах вісяць,
  Кранаюцца таемна зданяў рукі,
Каб непрыкметна ў струнах абуджаць
  Прыемныя й засмучаныя гукі.

Мы казкамі паданні ўсе завём,
  Глухія днём, мы дня не ўсведамляем;
Але ў сутонні казкамі жывём
  І цішыні дарэшты давяраем.

Мы ў прывіды не верым; толькі й нас
  Заве любоў, гняце туга разлукі...
Я адчуваў, я чуў іх, і не раз –
  Сумотныя і радасныя гукі!

*1903–1905*

## ***Вяршыня***

*(Вершина)*

Лясы, скалістыя цясніны –
Ўвесь дзень там, у канцы цяснін,
Спаруда снежнае вяршыні
З-па-за лясных глядзіць вяршынь.

Няма жытла на ўзгор'ях дзікіх,
Лясы сінеюць і маўчаць,
І шэрага граніту пікі
На схілах скал з лясоў тырчаць.

Ды цэлы дзень, – куды ні кіну
Свой позірк па крутых гарах, –
Адна бялюткая вяршыня
Стаіць паўсюдна мне ў вачах.

Яна паўнеба заступіла,
Вышэй аблок пайшла вянком –
І ўсё змірылася, застыла
Прад тым ільдзістым мерцвяком.

*1903–1905*

***

*(Мы встретились случайно, на углу...)*

Спаткаліся няўзнак мы на рагу.
Я хутка йшоў – і раптам бляск надзеі
Прарэзаў вечаровую смугу
Іскрынкамі праз промністыя веі.

На ёй быў крэп, – газ подыху лягчэй
Узвеяў весні ветрык на імгненне,
А на абліччы і ў святле вачэй
Прыкмеціў я былое ажыўленне.

І ласкава кіўнула мне яна,
І злёгку твар ад ветру нахіліла,
І знікла за вуглом... Была вясна...
Яна мяне прабачыла й забыла.

*1905*

***

*(Густой зеленый ельник у дороги...)*

Густы зялёны ельнік ля дарогі,
Наўзбоч глыбокі снегавы занос.
Алень тут крочыў дужы, танканогі
І велічна цяжкія рогі нёс.

Вось след яго. Тут натаптаў сцяжынак,
Тут елку гнуў, скроб белым зубам лёд –
І шмат хваёвых крыжыкаў, асцінак
Абсыпалася з вецця на сумёт.

Вось зноўку след размераны на полі,
І раптам скідка ў снежную смугу.
Губляецца сабачы гон – і голле
Зламанае рагамі на бягу...

Ах, лёгка як сыходзіў ён далінай!
Шалёна як! І колькі сілы ёсць
У радаснай імклівасці звярынай
Ён ратаваў ад смерці прыгажосць!

*1905*

## *Араты*
## *(Пахарь)*

Ужо ў блакітнай павалоцы неба,
Палі ў смузе вясновай. Зноў папар
Ару я – на прышчэпы лезе глеба,
Пласты зямлі, бясцэнны боскі дар.

Па баразне іду за сашнікамі,
Дзе мяккі след прыемна пакідаць, –
І так цудоўна босымі нагамі
Ў разору аксамітную ступаць!

Лілова-сінім морам чарназёму
Блукаю я. І дзесьці там, за мной,
Дзе цьмяны бляск ляжыць на даху дома,
Запахла ўжо вясной.

*1903–1906*

## *Дзве вясёлкі*

*(Две радуги)*

Вясёлкі дзве – і залацісты, рэдкі
Вясновы дождж. Вось-вось пасля грымот
Праблісне захад промнямі. Дзе сеткі
Садоў, густых ад травеньскіх нягод,
На змрочным фоне хмары азаронай
Чарнее птушка. І свяжэй святло
Вясёлак фіялетава-зялёных
І смачны пах жытоў.

*1903–1906*

## *Дзяцінства*
*(Детство)*

Чым спёка больш, тым лепей у бары
Мне дыхаць вольным водарам смалістым
І весела на ранішняй зары
Блукаць палацам сонечна-цяністым!

І бляск паўсюль, і зыркае святло,
Пясок – як шоўк... Тулюся да сасонкі.
Мне толькі дзесяць. Колькі год прайшло,
А ствол – гігант цяжкі, магутны, гонкі.

Кара маршчыніць колерам віна,
Працятая ўсёй цеплынёй сусвету!
І мне здаецца, пахне не сасна,
Належыць гэты пах самому лету.

*1903–1906*

## *Баркун*

*(Донник)*

Брат – боты ў пыле на нагах –
Прынёс, вярнуўшыся з узлеску,
Квет, што ўзрастае на палях,
Квет баркуну – сухмені вестку.

Я ўстаў ад кніг і ў стэп пайшоў...
Так, поле – залатой абновай,
І адусюль шматкроп'і пчол
Плывуць у спёцы вечаровай.

Паўсюль мярэжай машкара,
Святло шафраннае лунае –
Гарачыні прыйшла пара.
Сухмень. А жыта даспявае.

Хлеб спее, як бяды вястун –
Мажліва, й голаду па леце.
Ды гэты залаты баркун
На міг мілей за ўсё на свеце!

*1903–1906*

## ***Дзюны***

*(Дюны)*

За шызымі дзюнамі – поўначы цьмяны туман.
  За шызымі дзюнамі – шэры прасцяг акіяна.
На зыбе халодным, ля берага – чорны баклан,
  Над зыбам лунае высокая шыйка баклана.

За шызымі дзюнамі – поўнач. Гады – у рады
  Праходзяць, як цені, старыя нарвежскія шхуны –
І зноўку – нябёсы, халодная пустка вады,
  Туман сіняваты і дзюны.

*1903–1906*

## *Каменная Баба*

Жмуты сухія мёртвае травы.
Бязмежны стэп, а даль сінее слаба.
Вось тут парэшткі конскай галавы.
Вось зноўку – Каменная Баба.

Як сонна выглядае плоскі твар!
Брутальнае, бы ў першабытных, цела!
Стаю, баюся, што прыму твой дар...
Ты мне ўсміхаешся нясмела.

О, дзікае стварэнне даўняй цьмы!
Ці ты было калісьці грамавержцам?
– Не Бог, не Бог стварыў нас. Гэта мы
Багоў тварылі рабскім сэрцам.

*1903–1906*

## *Áгні*

*(Агни)*

У цьме ляжу, забіты злою сілай.
Чакаю, нерухомы і нямы:
Ідуць, пяюць над свежаю магілай,
Вяшчаюць лёс мой і нясуць агні.
Звіняць шчыты, завуць мяне дамоў,

Як енк стовусны плач цячэ панылы.
Ды лёгка мне: ты, Агні светлакрылы,
Мяне ўратуеш, скінеш цемры схоў.

Браты, глядзіце, ворагі – ўсё роўна,
Бог, гудучы, ахопіць мой касцёр,
Кальчугу бляскам золата напоўніць!

Ацішце смутак плакальшчыц-сясцёр:
Сам бог мяне ахвярай распасцёр,
Каб адрадзіць на светлазарным Поўдні!

*1903–1906*

## ***Сон***

*(Сон)*

*З кнігі прарока Даніїла*

Цар! Вось твой сон: зіхцеў сярод даліны
Перад табой вялізны стод-балван,
Што ўсцяж таптаў зямлю ступнёю з гліны.

Аблічча меў чырвонае, жупан,
Было са срэбра на грудзях убранне,
І з медзі – сцёгны моцныя і стан.

Ды час прабіў, прызначаны зараней, –
Абрынуўся ў даліну сам сабой
Цяжэрны камень з дальняй горнай грані.

Цар! Час прабіў, лёс кожны мае свой:
Зляцеў у дол, змяшаў металы з глінай
І прах узняў, як пыл над малацьбой.

Бог зруйнаваў металу бляск ў адзіны
Кароткі міг: развеяў і сляды,
А камень стаў вялікаю вяршыняй.

Сусветам авалодаў. Назаўжды.

*1903–1906*

## *Атлант*

...І доўга, доўга йшлі мы пласкагор'ем,
Між дзікіх скал – вышэй, вышэй да неба,
Па зблытаным кустоўі, у тумане,
Які то засціў сонца, то, як дым,
Праносіўся па ветры перад намі –
І раптам схон, бяздонная прастора
І ў глыбіні прасторы – неабсяжны,
Туманна праявіўся ў даляглядзе
Сваёй узнёсла-зыбкаю раўнінай
Паўднёвы, цёмна-сіні Акіян!
І сатана спытаў, калі спыніўся:
«Ці верыш ты ў паданні, у легенды?»

Быў сакавік, і толькі што мы выйшлі
На строму найвышэйшую з уцёсаў,
Насустрач нам дыхнула завірухай,
І я разгледзеў з горнай вышыні,
Што пышнасць фарбаў поўдня ў Акіяне
Злагоджана яе дыханнем смужным
І што ў гарах, якія йдуць да ўсходу,
Зігзагамі хрыбтоў сваіх, бялеюць,
Праз цьмяную аддаленасць, снягі –
Завоблачныя велічныя кражы
Ў халодных вечных саванах сваіх.
І Дух спытаў: «Ці верыш ты ў Атланта?»

Ледзь на скале трымаўся я, а вецер
Сарваць мяне хацеў, насіўся побач
І звонка завываў у нізкарослых,
Пакрыўленых, памятых бурай соснах,
Даносячы з глухое глыбіні
Шырокі шум – шум Вечнасці, працяглы
Шум хваль далёкіх... Як арол-падлётак,
Што ўскрыліў сам з радзімага гнязда
Над грозным Акіянам, быў я шчасна
Захоплены тады тваёй спрадвечнай
І неспасціжнай сілаю, Атлант!
«О, так, Тытан, я верыў, прагна верыў».

*1903–1906*

## *Дагестан*

Будзь пільным, хай і конь прыстане твой.
У прорве змрок ды шумныя каскады.
І да нябёс скалістыя грамады
Ў канцы цясніны высяцца сцяной.

Над іх чалом – алмазы зор далёкіх.
А на грудзях у змрочнай цішыні
Ляжыць аул: дракон тысячавокі
Гняздуе ў вышыні.

*1903–1906*

## *Айя-Сафія*

*(Айя-София)*

Свяцільні палымнелі, дзіўна мова
Гучала, як вялікі шэйх чытаў
Святы Каран, – і купал паступова
Ў панурай вышыні знікаў.

Свой ятаган узняўшы над натоўпам,
Заплюшчыў вочы шэйх – і ніцы страх
Апанаваў усё – сляпым і мёртвым
Натоўп ляжаў на дыванах...

На золку храм святлеў. І ўсё маўчала
Ў пакорлівай, свяшчэннай цішыні,
І сонца ярка купал азаралала
Ў неспасцігальнай вышыні.

І галубы ледзь чутна буркавалі,
І з паднябесся, з кожнага акна,
Абшары неба ўвысь салодка звалі
К табе, Любоў, к табе, Вясна!

*1903–1906*

## *З акна*

*(Из окна)*

Вецце кедра – вышыўкі зялёным
Цёмным плюшам свежым і густым,
А за плюшам кедра, за балконам –
Сад празрысты, лёгкі, быццам дым:

Яблыні і сцежкі ў таямніцы,
Як смарагды яркая трава,
На бярозах ніцых завушніцы
І галінак сіняя канва.

А на клёнах – дымчата-скразная
з залатымі мушкамі вуаль,
а за ёй – лагчынная, лясная
растае ў блакіце золкім даль.

*1906*

## ***Джардана Бруна***

*(Джордано Бруно)*

«Каўчэг пад правадырствам у асла –
Вось свет людзей. Жывіце вы ў Сусвеце.
Зямля – прытон хлусні, падману, зла.
Жывіце вечнаю красой, як дзеці.

Зямелька-маці, ты душы маёй –
Далёкая і блізкая лагода,
Ды гэта радасць поўніцца тугой,
А ў ёй, як таямніца, – асалода!»

І вось ужо вандроўны посах з ім:
Прабачце, келляў змрочныя скляпенні!
Жыве яго душа, чужая ўсім,
Удыхваючы вольныя імгненні.

«Вы ўсе рабы. Цар вашай веры – Звер:
Я зрыну трон сляпой і змрочнай веры.
Вы ў капішчы: я расхіну цяпер
Вам дзверы на блакіт і бездань Сферы.

Ні ў прорвы, ні ў жыцця няма мяжы.
Мы з вамі спынім сонца Пталамея –
І вір планет у зорнае імжы,
Хай вечна перад намі палымнее!»

Адважыўся на ўсё – аж да нябёс.
Ды разбурэнне – прага да тварэння,
Ён, разбураючы, чакаў дзівос –
Чароўнае гармоніі Стварэння.

Ярчэюць вочы, калі мара ёсць,
Якая ў свет адкрыццяў нас уносіць.
А ў ісціне – сэнс, мэта, прыгажосць.
Ды тым мацней і сэрца волі просіць.

«Ты – як анёл, а так – дзяўчо дзяўчом,
Што мне пяе над старадаўняй лютняй!
Я мог быць тваім бацькам, сябруком...
Ды я адзін. Ці знойдзеш кон пакутней?!

Я сцяг сваёй любві высока нёс.
Ды ёсць на свеце радасці другія:
Абледзяніў я ўсіх жаданняў лёс.
Я толькі твой, сэнс існасці – сафія!»

Ён зноў вандроўнік. І, каб мэту мець,
Глядзіць удалеч, твар ярчэе строга.
А супастатам век не зразумець,
Што Бог – Святло. І ён памрэ за Бога.

«Свет – бездань. Толькі атам кожны ў ёй
Працяты боскай воляй і красою.
Мы, жывучы, і скон прымаем свой
Адзінай, усясветнаю Душою.

Ты, з лютняю! А сны тваіх вачэй
Жыццё і Радасць гэту люстравалі?
Ты, сонца! вы, сузор'і ўсіх начэй!
Вы Радасць толькі гэтую ўдыхалі».

Маленькі і трывожны чалавек
З паглядам цвёрдым, яркім і халодным,
Ідзе ў агонь. «Сканаю ў рабскі век,
Абвесцяць несмяротным – у свабодным!

Я паміраю – бо такі расклад.
Развейце, кат, нікчэмны прах, развейце!
Вітаю шчыра вас: Свет! Сонца! Кат! –
Рассее ён сэнс думак па Сусвеце!»

*1906*

## ***Безнадзейнасць***

*(Безнадежность)*

На поўначы – ружовыя імхі,
Ядвабна серабрацца выдмы-дзюны…
Ды цёмных хвояў звонкія вярхі
Пяюць, пяюць над морам, быццам струны.

Паслухай. Прытуліся да сасны:
Пяшчоту чуеш праз вятроў завейнасць?
Але й яна пяе свае паўсны.
На поўначы нас цешыць безнадзейнасць.

*1906–1907*

## *З карабля*
*(С корабля)*

Жыццю – жыццё! Бурун каля лагуны,
Ля шызых камяністых берагоў.
Чырвоны кіль даўно разбітай шхуны,
Ды хто шкадуе мёртвых маракоў?

У вільгаці пясчанай сохнуць косці...
Ды радасць сонца, неба біруза
Яшчэ свяжэй пры ранішнім норд-осце –
І бляск касцей для вока драбяза.

*1906–1907*

***

*(В степи, с обрыва, на сто миль...)*

З абрыву ў стэпе на сто міль
Марскі абсяг адкрыты зроку.
Унізе стромы – гліна, цвіль,
Між трэсак косткі бачны збоку.

Тут ноч таполямі гула,
Дрымотна мора бушавала –
Ды раптам вохнула зямля
І бераг зрынуўся абвалам.

І сёння там стаяць, глядзяць,
А парасонікі шматлікай
Гурмой на сонейку блішчаць
Над прорвай пеннаю і дзікай.

Ніхто не знаў, што тут – пагост.
Каму патрэбны тыя косці!
Вясновы ветрык усур’ёз
Сябруе толькі з маладосцю!

Унізе – труны паплылі...
Так, мора бераг косіць, косіць
Сярпамі хваль – і ад зямлі
Адкіды ўдалячынь уносіць!

*1906–1907*

## ***Балагол***
*(Балагула)*

Уцякае таратайка і трасе мяне.
Рыжы Айзік правіць парай, смокча свой тытун.
Мак пунсовы з жыта раптам сполахам зірне.
Залацяцца, льюцца ніткі тэлеграфных струн.

«Айзік, Айзік, вы заснулі!» – «Ха! А ці васпан
Едзе ў горад з інтарэсам? Пан – паэт, артыст!»
Праўда, праўда. Што мне гэты брудны Акерман?
Стэп прывольны, дзень халодны, суш ды ветру свіст.

Быў я сынам, братам, бацькам, мужам, сябруком.
Быў заможным... Марна ўсё! Усё сышло ў нішто!
Заплачу за шлях табе вянчальным персцяньком.
Потым... Потым у карчомку: вывезе лато!

*1906–1907*

## *Закон*

Уславім Бога! Ён невыпадкова,
Як даў трыснёг, каб мы маглі пісаць,
Сказаў: шануй напісанае слова,
Змажы зрабіць, што змог паабяцаць.

Прыняў закон, прымі яго вярыгі.
Ці адштурхні, ці вер душою ў лад:
Не будзь аслом, што ўпарта носіць кнігі
Адно таму, што несці ёсць загад.

*1906–1907*

## *Дзія*
*(Дия)*

Штыль у бязмежна-светлым Ак-Дэнізе.
Аул, цвіце міндаль, і цішыня.
І цеплыня ў мячэці на карнізе,
Дзе турманы буркуюць сярод дня.

На схіле там пад стромаю нястомна
Цурчыць фантан. Ідуць адтуль уніз,
Уступы дахаў па крутых адхонах,
Далей – бямежна бачны Ак-Дэніз.

Яна ўжо там. Вясёлы і спакойны
Яе пагляд. Ступае, як джэйран.
А пад ядвабам па-дзіцячы стройны
Высокі стан... Яна напоўніць збан,

На камень скіне яркія папучы,
Бялізну будзе мыць, таптаць да дна...
– Журчы, цурчы, звіні, ручай пявучы,
Тваім люстэркам цешыцца яна!

*1907*

## *Храм Сонца*

*(Храм Солнца)*

Шэсць залацістых з мармуру калон,
Бязмежная зялёная даліна,
Ліван у снезе, неба сіні схон.

Сфінкс-волат, Ніл былі перад вачыма,
І піраміды: ты вякоў спакон
Прывабней, дапатопная руіна!

Там папялястых глыбаў шмат здавён,
Забытыя магілы ў акіяне
Адных пяскоў. Тут – радасць юных дзён.

Патрыярхальна-велічнае тканне –
Вяршыняў гор, заснежаных заўжды, –
Нібы стракаты талес на Ліване.

Пад ім лугі, зялёныя сады,
І вабны, як салодкая прынада,
Шум быстрай малахітавай вады.

Пад ім стаянка першага намада.
І хай яна – адно забыты след:
Адвечным сонцам свеціць каланада.

Як брама, што вядзе ў шчаслівы свет.

*1907, Баальбек*

***

*(Кошка в крапиве за домом жила...)*

У крапіве каля дома жыла,
Дома, што моўчкі гібеў, як магіла.
Кошка ў яго толькі ноччу хадзіла
І замірала насупраць стала.

Стол пад бажніцай стаяў – ды забылі,
Так у куце і застаўся стаяць.
Воску сляды на падлозе блішчаць –
Гэта жалобныя свечкі спачылі.

Помніш? Ляжаў тут самотны дзядок:
Ціха стуляліся вейкі – пакорны
Гальштук бародку падтрымліваў чорны.
Свечкі палалі, вярэдзячы змрок...

Цёмны цяпер дом начамі стаіць.
Кошка прыходзіць і свеціць вачамі.
Кут у цямрэчы мігціць абразамі.
Вецер у печках шуміць.

*1907*

## *Пустка*
*(Пустошь)*

Мір вам, спачылыя ў зямлі! – За садам
Пагост рабоў, пагост дваровых нашых:
Дзве дзесяціны пусткі занядбанай
З магільнымі грудкамі. Ні крыжоў,
Ні дрэўца. Толькі дзесьці ацалелі
Тут цудам пліты з каменю, ды й тое
Паедзеныя часам, быццам воспай...
Цяпер іх хутка выберуць – і будуць
Выворваць там то порыстыя косткі,
То суздальскія чорныя іконы.

Мір вам, даўно забытыя! – Хто знае
Імёны іх? Яны жылі – у страху,
Нязнанымі – спачылі. Тут, бывала,
Закоўвалі ў кайданы, высялялі,
Да смерці білі-секлі. Ды сціхаў
Плач аднастайны бабскі – зноўку сонна
Дні працы йшлі, пакорлівасці, страху...
Цяпер з таго жыцця сустрэнеш зрэдку
Кавалкі пліт каменных. Але плуг
Жалезны пройдзе – пустка ўскаласіцца
Жытамі густа. Косткі – угнаенне...

Мір вам, бездапаможным! – Відавочца
Вялікага і подлага, бяссільны,
Як сведка катаванняў, зверстваў, гвалту,
Чыё чало пазначана навекі
Таўром раба, нявольніка, халопа,
Я гавару вам, мёртвым: «Спіце, спіце!
Не вы адны цярпелі – тут і ўнукі
Кіраўнікоў і ўладароў зазналі
Не менш за вас наступстваў горкіх рабства!»

*1907*

## *Дзікун*
*(Дикарь)*

Над стромай цёмных скал арол лунаў.
За стромай – сінь, туманнае памор'е.
Ён па здабычу, як у сне, спяшаў
На гэтым паднябесным пласкагор'і.

З высозных скал ляцелі ўніз кусты,
Ды дзёрзкасць іх вар'ята не спыніла:
Ён пнуўся ўвысь да большай віднаты –
І бездань смерці бездань давяршыла.

Ты знаеш, як глыбока ў сіняву
Сыходзіць грыф, уджалены стралою?
І ён напружыў туга цеціву –
І зашумелі крылы над скалою,

І захлынуўся ў сіняй прорве грыф,
І кроў, што пырснула з нябёсаў зоркай
На бераг і на белай вапны рыф,
Змыў акіян смарагда хваляй горкай.

*1906–1908*

## *Бог*

Дзьмуў з мора брыз, і месяц чыстым рогам
Стаяў за доўгай вуліцай сяла.
І клаўся цень ад хаты за парогам,
А хата бляклa-белаю была.

Паўднёвы брыз дадаў начы цяпла.
На водмелях, што цягнуцца разлогам,
Марская хваля размаўляла з Богам,
Не ўскідваючы соннага чала.

Схіляўся месяц па-над ярам цёмным
І на пагост свяціў, на схілы гор.
А Бог навокал радасць распасцёр:

Ён ветрам быў, маёй душой бяздомнай –
І скаланаўся дзіўным бляскам зор,
Сінечай неба чыстай, векапомнай.

*1908*

## *У архіпелагу*

*(В архипелаге)*

Дзень восеньскі ў ліловым бляску зыба
Ярчэў, як медзь. Эол і Пасейдон
Вялі ў снасцях пявучы доўгі стогн,
Наш карабель даваў нырца, як рыба.

Быў бачны мыс. Висока там, на згібе,
Празрыста ўстаў няроўны рад калон.
Ды спевы рэяў так хілілі ў сон –
Плыў карабель ў буйным ліловым зыбе.

І ўсё адно, што гэта даўні храм
На мысе, там – забыты порцік Феба!
Запомніў я адно калоны й неба.

Дым аблачын – заслонаю гарам,
Пустынны мыс – нібыта бохан хлеба.
Я жыў у сне. Багоў тварыў я сам.

*1908*

## *Бог паўдня*

*(Бог полдня)*

Я чорных козак пасвіла з сястрой
Між скал чырвоных, колкіх траў і гліны.
Заліў сінеў. Каменне грэла спіны –
На ясным сонцы спала пад гарой.

Прылегла я ў сухі цянёк масліны
З каструбаватай срэбнаю карой –
І ён сышоў, нібы кузурак рой,
Нібы пякучы нерат павучыны.

Ён азарыў мне ногі. Агаліў
Іх да калень. І на кашулі звонку,
Гарэў агнём. На спіну паваліў.

Салодка абдымаў мяне і ёмка.
Ён смочкі мне загарам атуліў
І навучыў варыць настой рамонка.

*1908*

***

*(В полях сухие стебли кукурузы...)*

Сухія ў полі сцёблы кукурузы,
Бацвінне бляклае, вазоў сляды.
У стылым моры – бледныя медузы,
Трава, што чырванее з-пад вады.

Палі і восень. Мора і крутыя
Адхоны скал. Мы ў ноч ідзем якраз
На цёмны бераг. Мора ў летаргіі
Раскрые таямніцы ўсе для нас.

«Ваду ты бачыш?» – «Бачу толькі ртутны
Туманны бляск...» Ні неба, ні зямлі.
Пад намі зоркі пылам каламутным
Бяздонна-фасфарычным ажылі.

*1908*

## ***Сабака***

*(Собака)*

Зноў марыш. Але нешта ўсё змрачней
Глядзіш ты залацістымі вачамі
На двор, на снег, які наліп на раме,
На прывіды таполевых алей.

З уздыхам ты стуліўся пацяплей
Ля ног маіх і думаеш... Мы самі
Клапоцімся тугой чужых падзей,
Тых пустак, што... за пермскімі гарамі.

Ты ўспамінаеш свет, што не па мне:
Сівое неба тундры, льды і чумы
Ў тваёй сцюдзёнай, дзікай старане.

Ды я заўжды дзялю з табою думы,
Я ж чалавек: як бог, спазнаць магу
Усіх краін і ўсіх часоў тугу.

*1909*

## ***Вечар***

*(Вечер)*

Пра шчасце мы ўсе толькі ўспамінаем.
А шчасце ўсюды. Можа, вось яно –
За пуняй сад, дзе яблыкі збіраем,
Струмень паветра, што цячэ ў акно.

У неба бездань лёгкім белым краем
Узносіцца хмурыначка. Даўно
Сачу за ёй... Мы мала бачым, знаем,
А шчасце для дасведчаных адно.

Акно адчыненае. З піскам села
На падваконне птушка. Я ад кніг
Адводжу позірк стомлены на міг.

Дзень вечарэе, неба апусцела.
Гул малатарні чутны на гумне...
Я бачу, чую. Шчасце ўсё ўва мне.

*1909*

## *Бярозка*

*(Березка)*

На перавале дальнім, на краі
Пустых нябёс, ёсць белая бярозка:
Ствол, бурамі знявечаны, і плоска
Раскінутае вецце. Не ў гаі
Любуюся я ёй, а ў голым полі.

Няма жыцця. Дзе цень, пластамі солі
Ляжыць мароз. І сонечны адсвет
Не грэе. Без лістоты сілуэт
З карункамі галін чырванаватых,
Бялюткі ствол у зелені імжы...

Ды восень – свет, дзе мары-міражы,
Сум думак аб даўно мінулых стратах.
На перавале дальнім, на мяжы
Пустых палёў, бярозцы адзінока.
Ды лёгка ёй. Яе вясна – далёка.

*1906–1911*

## *Да маці*
*(Матери)*

Я помню спальню і лампадку,
Забаўкі, ложак цёплы ў згадках
І мілы, ціхі голас твой:
«Анёл-ахоўнік над табой!»

Бывала, нянька распранае,
І ўсё паўжартам ушчувае,
А сон салодкі ўжо ў вачах,
Схіляе да яе пляча.

Ты пажагнаеш, пацалуеш,
Напомніш мне, што ён са мной,
І ў шчасце верай зачаруеш...
Я помню, помню голас твой!

Мае пра цёплы ложак згадкі,
Пра сонны прыцемак вугла
І цень ад ланцужкоў лампадкі...
Анёлам ці не ты была?

*1906–1911*

## ***Пскоўскі бор***

*(Псковский бор)*

Цямнее даль гушчэчы строгай.
Пад гонкай мачтай, пад сасной
Стаю і мару – ля парога
Ў сусвет забыты, але мой.

Ці вартыя сваіх мы спадчын?
Мне вусцішна, калі адзін,
Дзе рысь з мядзведзям сцежкі значаць,
Вядуць да казачных мясцін,

Дзе гронка спее на каліне,
На цвілі ржавяцца імхі
І ягадай туманна-сіняй
Ядловец хваліцца сухі.

*1912*

## *У Сіцыліі*

*(В Сицилии)*

Дзе кляштары на схілах гор глухіх,
Як спадчына разбойнікаў марскіх,
Прыстанкі занядбаныя, пустыя, –
Мая душа жыла калісьці ў іх:
Люблю вас, келлі простыя, малыя,
Двары між сценак голых і цяжкіх,
Валы, ірвы, ад цвілі скрозь сівыя,
Пад вежамі паўсюль хмызы густыя,
Камення крушні коўзкія, як глей,
Што завалілі схілы узбярэжжаў,
Дзе між маслінаў бачыцца сіней
Вада ля скал, дзе моцна грае свежы,
Салёны брыз лістотаю маслін
І дорыць ветру дзіўны водар кмін!

*1912*

## ***Слова***
*(Слово)*

Маўчаць магільні, муміі ды косці –
  Вядзецца так здаўна.
Гучаць з сусветнай цемры на пагостах
  Адно пісьмёны нам.

Адзіны ў нас набытак ёсць славуты!
  Яму ты гаспадар,
Дык зберажы праз страты і пакуты
  Спрадвечны мовы дар.

*1915*

## *У арабскай вёсцы*

*(В арабской деревне)*

Калі легчы спаць на даху летам,
Даўняй пальмы блытаны віхор
Павышэе ў небе сілуэтам,
Аж да зор раскіне свой узор.

А калі зірнеш ты ў бок Сіная,
Там, дзе ўсходзіць месячык, заўжды
Даль пустыні ззяе залатая,
Быццам гладзь разлітае вады.

Летуценіць ты даеш нам, Божа!
Хто не марыў – ноччу пагатоў,
Што пад поўняй з ім падзеліць ложа
Дзева чатырнаццаці гадоў!

*Глотава, 1915*

## *Брэтань*
*(Бретань)*

Ноч ледзяная і нямая.
Пяскі і скалы берагоў.
Свой цяжкі ветразь узнімае
Рыбак – ідзе на дальні лоў.

Нашто яму лёс лоўчы трэба?
Нашто ў аглухлы зыб зімы
Свой невад распасцёр ты ў неба,
Рыбак бязлітасны, нямы?

Святло, што льецца срэбрам вечна,
Крыжы загіблых. І ў туман
Сыходзіць плашчаніцай млечнай
Пад зорнай сеткай акіян.

*1916*

## *Кадзіла*

*(Кадильница)*

Між гор Сіцыліі, у кляштары забытым,
Па сутарэннях цёмных, па шчарбатых плітах
Пастух прывёў мяне ў пакінуты касцёл,
Я ўбачыў там у алтары пусты прастол,
А ў друзе перад ім – магільна-залатое,
Даўно патухлае, даўным-даўно пустое
Кадзіла кінутае – чорнае ўнутры
Ад вугалю й смалы, што ў ім даўней палалі...

Ты, сэрца, дзе агонь і водар гралі,
Не забывай яго. Да чарнаты згары.

*1916*

## ***Кабыліца***

*(Кобылица)*

Я зняў аброць, сядло – і вольна
Яна рванула ад мяне,
А я схіліўся багамольна,
Прад сонцам дня, што гас у сне.

Яна ўзмахнула лёгкай грывай
Пачула ветру пах, але
З тугой пяшчотнай і шчаслівай
Камусьці жарсці покліч шле.

Адзіны боскія стварэнні,
Хай будзе слаўны Творца іх,
Які з'яднаў усе хаценні
І ўсе тамленні – у маіх.

*1916*

## ***Стой, сонца!***

*(Стой, солнце!)*

Ляцяць, блішчаць, мільгаюць дні, як спіцы,
  Сумую і дрыжу.
А ўсё далей з лятучай калясніцы,
  А ўсё далей гляджу.

А ў далі што? Абрыў, правал, цясніна,
  Крывавы след зары...
О, калі ўладу б і загадны крык Навіна:
  «Стой, сонца! Стой, замры!»

*1916*

***

*(Солнце полночное, тени лиловые...)*

Сонца паўночнае, цені ліловыя,
Зыб на калдобінах, жоўтая золь.
Сонца не грэе – на твары суровыя
Падае промнямі холад. Юдоль.

Зніклі крыжы Салавецкай абіцелі.
Пуста да мора, да полюса. Дождж.
Стылай імжой уцякаюць свяціцелі –
Трое дзядкоў-мужычкоў басанож.

*1916*

## *Малады кароль*

*(Молодой король)*

То не голуб чырвоны ўзвіўся
Цёмнай ноччу над чорнай гарою –
Чорнай хмарай заззяла зарніца,
Асвятліла платы і хаты,
Громам грыміць далёкім.

– Ваша каралеўская міласць, –
Каралю гаворыць Алена.
А кароль на каня сядае,
Ён спрабуе надзейнасць папругі
І аблічча Алены не бачыць.
– Ваша каралеўская міласць,
Пашкадуйце сваё каралеўства:
На ноч гледзячы, нельга ў горы,
Ваша міласць, стан ворага блізка.

Кароль маўчыць, ані слова,
Спрабуе, ці моцнае стрэмя.
– Ваша каралеўская міласць, –
Каралю гаворыць Алена, –
Пашкадуйце малых сваіх дзетак
Ды сваю маладую жонку,
Вы майго жаніха пашліце! –

Кароль у адказ ёй ні слова,
Павады разбірае ў цемры,
За зарніцамі горнымі сочыць.
І заплакала Алена горка,
І сказала каралю ціха:
– Вы ж у нас начавалі ў хаце,
Ваша каралеўская міласць,
На бяду маю начавалі,
На маё вялікае шчасце.
Пабудзьце яшчэ хоць да ранку,
Бацьку майго пашліце!

Не гарматы ў гарах грукочуць –
Гром па гарах ходзіць,
І залева, у лужынах, плешча,
Сіняя зарніца асвятляе
Дажджавыя доўгія голкі.
Чарнату варанёную ночы
Саламяныя мокрыя стрэхі;
Пеўні гучна спяваюць у вёсцы, –
Ці спрасоння, ці з перапуду,
Ці да вясёлай ночкі...
Сядзіць кароль наш на ганку хаты.

Ах, які гэта цуд, Алена!
Смела крочыць яна па гноі.
Спрытна сыпле каню корму.

*1916*

## ***Вечаровы жук***

*(Вечерний жук)*

На ліловым небе
Поўні жаўцізна.
Блытаецца ў хлебе
Змрочная струна:

Шорах цвердакрылы –
І дрымотны жук
Пацягнуў панылы,
Ды спакойны гук.

Міг і ўсё прымеціў,
Азірнуўся – цьма
Толькі месяц свеціць,
Вечара няма:

Поўня, ноч і неба.
Бледны, як ратай
У чаканні хлеба,
Мёртвы родны край.

*1916*

***

*(Край без истории... Все лес да лес, болота...)*

Край без гісторыі... Лясы й лясы, балоты,
Дрыгва, імшарыны, альшанікі заток.
Магутнасць явараў... На белізне аблок –
Барвянасць захаду, краса і пазалота,
Бляск, цеплыня наўкол. А на нізінах цень,
Сівы, халодны дым... Стаю, зрабіў агмень,
Куру, сціраю пот... Свяжэе – востра, сыра
І дзіўна пахне глуш. Нябачнага мне кліру
Танюткія пяюць і ныюць галасы.
Слупом таўчэцца гнус, загадкавы і слабы
Свіст у кузе вужоў... Прыцьмеласць паласы
Ледзь цёплых прамянёў, вось закрактала жаба
У па́ры над вадой... Каўтунны край драўлян,
Русь кіеўскіх князёў, ласёў, мядзведзяў, тураў,
Палессе бортнікаў і чорных смалакураў –
Сутоння цёплы, з лёгкай чырванню шафран.

*1916*

***

*(Нет Колеса на свете, Господин...)*

Няма на свеце Кола, Пан-Спадар:
Ёсць толькі абады, утулкі, спіцы.
Ёсць конь, дарога, прыхамаць вазніцы,
Жалеза бляск і грукат у абшар.

А свет, а мы? Няўжо мы не падобны
На Кола? Так, падобны, ягамосць.
Ды ёсць, што нам за Колы ўсе каштоўней:
Пра Кола Думка ёсць.

*1916*

## ***Старая яблыня***

*(Старая яблоня)*

Бы ў снягах, на зайздрасць іншым кронам,
Ты гудзіш уся чароўным звонам
Пчол і восаў завідушчых, злых...
Старышся, сяброўка дарагая?
Не бяды. Ці здарыцца такая
Маладая старасць у другіх?!

*1916*

## *Голуб*

*(Голубь)*

Белы голуб ляціць цераз мора,
Цераз сіне-зялёнае мора.
Белы голуб убачыў Кіпрыды,
Што стаіш на гарачым пяску,
Што кіпіць беласнежная пена
Па тваіх загарэлых нагах,
І птушынай стралою нясецца
Ён з-за хваль, дзе градою блакітнай
Выспы млеюць у сонца смузе,
Даляцеўшы, падзе ў захапленні
На тугія халодныя грудзі,
Што акроплены пырскамі хваль,
Дрыжучы, твае вусны шукае,
А гарачае сонца выходзіць
З-пад празрыстага воблака, спёкай,
Як алеем, цябе аблівае –
І Кіпрыда з усмешкаю боскай
Абдымае цябе за клубы.

*1916*

***

*(Никогда вы не воскреснете, не встанете...)*

Аніколі не ўваскрэснеце, не ўстанеце
Са сваіх гнілых магілаў, бо
На аблічча Боскае не глянеце –
Недасяжна гэта для рабоў,
Цёмных слуг пажады, злосці, лютасці,
Помсты, страху, хцівасці, ілжы,
Старасці азызлай, бруднай жудасці:
Закапалі – і ляжы!

*1916*

***

*(Полночный звон степной пустыни...)*

У поўнач стэп звініць пустынна,
Спакой нябёс, зямлі цяпло,
Сухі, гаркавы мёд палыну
І зор таемнае святло.

Чым так заслухаўся сабака?
Па-за жыццём і часам мы.
Сон – стэпавай начы пазнака –
Замроены сабой самім.

*1916*

***

*(Настанет день – исчезну я...)*

Надыдзе дзень – і знікну я,
А ў тым пакоі ў гэты час
І мэбля будзе жыць мая,
І старажытны мой абраз.

І будзе зноўку залятаць
Пад столь блакітную здалёк,
І шамацець, і трапятаць,
Ядвабам крылцаў матылёк.

І так жа будзе неба дно
Глядзець у гэтае акно
І мора роўнай сінявой
Зваць у абшар пустэльны свой.

*1916*

## *У ардзе*

*(В орде)*

За стэпам, ля Волгі ў пясках,
Барвовае сонца павольна танула.
Дзіцятка прыснула ў цябе на руках,
Ты выйшла з задушнай кібіткі, зірнула
На кроў, што ў люстраныя солі цякла,
На сонца, што ўлеглася, быццам на блюдзе, –
Са стэпу салодкай лагодай сухога цяпла
Аблашчыла твар твой, спатнелыя смуглыя грудзі.
Вялікі быў стан за табой:
Вярблюды раўлі і павозкі рыпелі,
І вогнішчы у дыме мацней палымнелі,
І пыл узнімаўся барвянаю цьмой.
Ты, ціхая сэрцам і зрокам нябога,
Ці ведала ты, як сядала ў пясок,
Што сонны дзіцёнак –
Ён смокча твой цёмны сасок –
Той самы Магол, пра якога
Давеку зямля не забудзе мая?
Ці ведала, Маці, што й я
Праслаўлю яго, – што не трэба мне раю,
Хрыста, Галілеі, лілеяў яе палявых,

Што я не лагодней за іх:
Атылы, Цімура, Мамая,
Што варты я гэтай арды,
Калі за маной не таюся,
Рву боскую хартыю ў скрусе –
І гвалчу, рабую, знішчаю, палю гарады?
Пагасла за стэпам палоска слюды,
І сонца ў трымценні ў пясках патанула.
Ты сумна ў патухлае неба зірнула
І ціха ўздыхнула ды вочы панурыла зноў...
Чарнелі бясконцыя раці вазоў,
А сіняя ноч прахалодай і горыччу дзьмула.

*1916*

***

*(Мы рядом шли, но на меня...)*

Ішлі мы побач, на мяне
Зірнуць была ты не гатова,
І ў сакавіцкім дні на дне
Губляліся пустыя словы.

Праз сад, дзе пелі капяжы,
Бялелі сцюжаю аблокі,
Бы твае шчокі, ды ў імжы
Цвіў твой пагляд валошкавокі.

І толькі ў смелых марах піў
Я паўраскрытых вуснаў горыч.
Яшчэ пустым і шчасным быў
Дзівосны свет, дзе йшлі мы поруч.

*1917*

***

*(В пустом, сквозном чертоге сада...)*

У скрозь пустым палацы саду
Шумлю лістотай залатой:
І, як ні дзіўна, гэта радасць –
Мінулае таптаць нагой!

І з асалодай, што раней я
Цаніў так мала, ўспамінаць!
Якія боль і сум – надзея
Яшчэ адну вясну пазнаць!

*1917*

## *Зорка мораў Марыя*
*(Звезда морей Мария)*

На дзікіх берагах Брэтані
Гудуць зімовыя вятры.
Пустымі, чорнымі ў тумане
Стаяць рыбацкія двары.

Журботна ўзняты твар мадоны
Ў старой капліцы. Дождж сячэ,
З яе заржаўленай кароны
На рызу белую цячэ.

Адзіная, зямному гору
Датычная! Ты, што дала
Імя сваё святое Мору!
Ноч цяжкаю для нас была.

Агнём марознае пустыні
Палаў сузор'яў ураган.
Пад намі хвалямі крутымі
Гудзеў шалёны акіян.

Рукой, ад холаду здранцвелай,
Я ладзіў ветразь карабля.
А ты сышла ва ўбранні белым
І стала да стырна пасля.

Мацнеў я духам, малаверны,
І ў цемры зорнай сінявой
Туманны німб, як водбліск серны,
Ззяў над тваёю галавой.

*1920*

## ***Выгнанне***

*(Изгнание)*

Сутонне свішча цёмнае ў пустыні.
  Палі ды акіян...
Спатоліць хто ў пустыні, на чужыне
  Боль хросных ран?
І чорнае распяцце, як памінкі
  Сярод дарог –
Дзе расхінуў журботныя абдымкі
  Спачылы Бог.

*Брэтань, 1920*

## ***Кенар***

*(Кенарь)*

*«На радзіме ён зялёны...»*
*Брэм*

Кенара былі з-за мора
Нам прывезлі, але ён
Залатым у клетцы з гора
Стаў, патрапіўшы ў палон.

Птушкай ізумруднай, вольнай
Ты ўжо стаць не зможаш, не.
Хоць пра дальні востраў здольны
Пець гулякам у карчме!

*1921*

***

*(У птицы есть гнездо, у зверя есть нора...)*

У птушкі ёсць гняздо, у звера ёсць нара.
  Было так горка сэрцу маладому,
Калі сыходзіў я з бацькоўскага двара,
  Казаць бывай старому дому!

У звера ёсць нара, у птушкі ёсць гняздо.
  Як сэрца гучна б'ецца мукай горкай,
Калі, жагнаючыся, йду ў наёмны дом
  З маёй ужо збуцвелай торбай!

*1922*

***

*(Мечты любви моей весенней...)*

Любові весняй летуценні,
На светлым ранні дзён маіх
Збіраліся гурмой аленяў
Ля запаветных вод рачных:

Найменшы гук у цьме зялёнай –
І сон дрыготкае красы,
Шчаслівай мараю натхнёны,
Ляцеў маланкаю ў лясы!

*1922*

***

*(В полночный час я встану и взгляну...)*

Апоўначы я ўстану і зірну
На поўню, што праглядвае праз цьму,
І на заліў пад ёю, і на горы,
Што белым снегам свецяцца ўбаку...
Вада іскрыцца ўнізе, на пяску,
Далей смуга, свінцовыя прасторы,
Халодны і туманны акіян...

Спазнаў я, як нікчэмна і не нова,
І выпетрана ўшчэнт людское слова,
Спазнаў надзей і радасцяў падман,
Любові марнасць, даўкую разлуку
З апошнімі, нямногімі, хто быў,
Хто блізкасцю сваёю прыгасіў
Нягожую для свету боль і муку,
Гадзін самоты сумныя часы
Бяссоннага паўночнага знямення,
Пагарды да зямлі і адчужэння
Ад той зямной бяздумнае красы.

*1922*

## ***Венецыя***

*(Венеция)*

Званоў напеў сярэднявечны,
Пявучы кліч, туга часоў,
І сэнс жыцця, што новы вечна,
І пра былое шчасны сон.

І памяркоўнасць, дараванне
І суцяшэнне: ўсё на звод!
І залатыя люстраванні
Палацаў у блакіце вод.

І дымка млечнага апалу,
І сонца, што змяшана з ім,
І стрэчны зірк, і апахала,
І ўсе каралі, што з каралу,
Пад катафалкам вадзяным.

*1922*

***

*(Шепнуть заклятие при блеске...)*

Шапнуць закляцце пры змярканні
Бліскучай знічкі я паспеў,
Ці зменіць лёс, як я хацеў?
Старыя ўзлескі, тыя ж твані
І тая ж поўнач, дзіч і глуш...
А калі б нават Бога сіла
Дапамагла, ажыццявіла
Надзеі нашых цёмных душ,
Дык, што?
Спрачаемся зацята,
А шлях назад для нас закляты,
Страт не злічыць і не забыць,
І аплявух салдат Пілата
Ўжо не прабачыць і не змыць,
Як і крыві пакут крыжовых,
Закатаваных у Хрысце,
Адвеку лік якіх расце,
Як не прыняць наступстваў новых –
Агіды ў голай гаркаце.

*1922*

## ***Два вянкі***

*(Два венка)*

На свяце ў гонар мой увенчаны быў я
Вянком лаўровым, ізумрудным:
Ён мне сцюдзіў чало, халодны, як змяя,
У зале пры застоллі людным.

Чакаю новага – і памятаю, ён
Мне з мірту выраблены будзе:
У зале труннай, той, дзе вечны змрок і сон,
Ён назаўжды чало маё астудзіць.

*1953?*

# ЗМЕСТ

Вясковы жабрак ..... 5
У стэпе ..... 7
***(Засціць сонца хмарай волкаю...) ..... 10
Анёл ..... 11
***(У старонцы дальняй ад святога краю...) ..... 13
Вясновае ..... 14
Сёмуха ..... 16
***(Няўлоўнае святло ліецца над зямлёю...) ..... 17
Завея ..... 18
***(Ноч надышла, а дзень прыгас...) ..... 19
***(Шлях віецца ў снезе. Стэп шырокі...) ..... 20
На хутары ..... 21
***(Скача прыпражная, снегам абдае...) ..... 22
***(Зайшоў апоўначы ў пакой...) ..... 23
***(Зноўку сон, чароўны і салодкі...) ..... 24
***(Зоркі ноччу вясновай пяшчотней...) ..... 25
***(За лесам лес. А дзень цямнее...) ..... 26
***(Яшчэ ранак не скора, не скора...) ..... 27
Крыніца ..... 28
Ноч на Вадохрышча ..... 29
***(Блакіт раскрыўся ў паднябессі...) ..... 32
***(На вышыні, на снегавой вяршыні...) ..... 33
***(Аціхла навальніца за гарою...) ..... 34
У старым горадзе ..... 35
Урывак ..... 35

***(Марозны подых цёмнае завеі...)....................................38
***(Не стамлюся апяваць вас, зоркі!..).................................39
Валацугі ....................................................................40
Смерць ........................................................................42
***(Чару з цёмным віном...)...............................................43
Напярэдадні Купалля ....................................................44
Адзінота ....................................................................46
Сутонне (Сівая скрозь смуга марозу...) ............................48
У гарах.........................................................................49
Прывіды ......................................................................50
Вяршыня......................................................................51
***(Спаткаліся няўзнак мы на рагу...)..................................52
***(Густы зялёны ельнік ля дарогі...) .................................53
Араты ..........................................................................54
Дзве вясёлкі ................................................................55
Дзяцінства ..................................................................56
Баркун .........................................................................57
Дзюны .........................................................................58
Каменная Баба .............................................................59
А́гні ...........................................................................60
Сон .............................................................................61
Атлант ........................................................................62
Дагестан......................................................................64
Айя-Сафія ....................................................................65
З акна..........................................................................66
Джардана Бруна ...........................................................67
Безнадзейнасць............................................................70

З карабля ........................................................................71
***(З абрыву ў стэпе на сто міль...) ........................................72
Балаголка ........................................................................73
Закон ................................................................................74
Дзія ..................................................................................75
Храм Сонца ......................................................................76
***(У крапіве каля дома жыла...)...............................................77
Пустка ..............................................................................78
Дзікун................................................................................80
Бог ....................................................................................81
У архіпелагу ......................................................................82
Бог паўдня ........................................................................83
***(Сухія ў полі сцёблы кукурузы...)..........................................84
Сабака ..............................................................................85
Вечар................................................................................86
Бярозка ............................................................................87
Да маці ..............................................................................88
Пскоўскі бор ......................................................................89
У Сіцыліі............................................................................90
Слова ................................................................................91
У арабскай вёсцы ..............................................................92
Брэтань ............................................................................93
Кадзіла ..............................................................................94
Кабыліца............................................................................95
Стой, сонца!........................................................................96
***(Сонца паўночнае, цені ліловыя...) ......................................97
Малады кароль ..................................................................98

Вечаровы жук ........................................................100
***(Край без гісторыі... Лясы й лясы, балоты...) ......101
***(Няма на свеце Кола, Пане...) ..........................102
Старая яблыня ......................................................103
Голуб ....................................................................104
***(Аніколі не ўваскрэснеце, не ўстанеце...)..............105
***(У поўнач стэп звініць пустынна...) ....................106
***(Надыдзе дзень – і знікну я...)............................107
У ардзе ..................................................................108
***(Ішлі мы побач, на мяне...) ................................110
***(У скрозь пустым палацы саду...)...........................111
Зорка мораў Марыя ..............................................112
Выгнанне ..............................................................114
Кенар ....................................................................115
***(У птушкі ёсць гняздо, у звера ёсць нара...)..........116
***(Любові весняй летуценні...)................................117
***(Апоўначы я ўстану і зірну...) ............................118
Венецыя ................................................................119
***(Шапнуць закляцце пры змярканні...)......................120
Два вянкі ..............................................................121

У серыі «Паэты планеты»,
акрамя «Выбранай паэзіі» Івана Буніна,
таксама ёсць у продажы зборнікі такіх паэтаў, як:

Сапфо
Франчэска Петрарка
П’ер дэ Рансар
Ўільям Шэкспір
Ёган Вольфганг Гётэ
Габрыэла Містраль
Умар Хаям
Шарль Бадлер
Райнэр Марыя Рыльке
Фрыдрых Гёльдэрлін
Генрых Гайнэ
Гіём Апалінэр
Эдгар По
Федэрыка Гарсія Лорка
Джон Кітс
Рыгор Барадулін
Дзімча Дэбялянаў
Гай Валерый Катул
Яраслаў Вырхліцкі
Ян Каханоўскі
Катры Вала
Канстандзінас Кавафіс
Барыс Пастарнак
Аляксандр Чакс
Хуан Рамон Хіменэс
Юлі Таўбін
Хаім Нахман Бялік
Баляслаў Лесьмян
Шандар Петэфі
Міхай Эмінэску
Ўільям Батлер Ейтс
Эмілі Дыкінсан
Алесь Разанаў
Мацуа Басё
Геарг Тракль
Сяргій Жадан
Рабіндранат Тагор
Сэсар Вальеха
Сігб’ёрн Обстфельдэр
Томас Стэрнз Эльёт
Арцюр Рэмбо
Нікалоз Бараташвілі
Фрыдрых Шылер
Умбэрта Саба
Марк Валерый Марцыял
Ўолт Ўітмэн
Візма Бэлшавіца
Мікола Зэраў
Адам Міцкевіч
Юсцінас Марцінкявічус
Бгартрыгары
Эдыт Сёдэргран
Ду Фу
Эрлінг Кітэльсен
Ўільям Блэйк
Уладзімір Маякоўскі
Томас Вянцлава
Гунар Экелёф
Вільгельм Мюлер
Анакрэон
Энхедуанна
Архілох
Срэчка Косавел
Фернанду Песоа
К. І. Галчыньскі
Дзмітро Паўлычка
Захірыдзін Бабур
Джордж Гордан Байран
Джакама Леапардзі
Міхась Стральцоў
Геарг Гайм
Стывен Крэйн
Стэйн Стэйнар
Назым Хікмет
Анна Ахматава
Цін Уевіч
К. К. Бачыньскі
Абу Убада аль-Бухтуры
Марына Цвятаева
Герыт Ахтэрберг
Нагапет Кучак

**Бунін**, І.
Б91 Выбраная паэзія / Іван Бунін; пер. з рускай Г. Ліхтаровіча. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2022. — 128 с. (Паэты планеты).
ISBN 978-985-23-0167-1.

Іван Бунін (1870–1953) – рускі пісьменнік, паэт, перакладчык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1933). Па бацькоўскай лініі паходзіў з літвінскай шляхты, па матчынай – са слуцкіх габрэяў. У беларускіх перакладах неаднаразова выдаваліся шматлікія празаічныя творы аўтара. Выбраная паэзія асобным зборнікам выдаецца ўпершыню.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**ББК 84(4Рус)-5**
**УДК 821.161.1-1**

Серыя «Паэты планеты»

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Іван Бунін

# ВЫБРАНАЯ ПАЭЗІЯ

Дызайн *Марціна Русецкага*
Рэдактар *Лявон Баршчэўскі*
Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

+12

Падпісана ў друк 19.01.2022. Фармат 60×90 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 3,21. Ум. друк. арк. 4,00.
Наклад 99 асобнікаў. Замова № .

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220114, Мінск.